Журнал международного права и международных отношений. 2021. № 3 (98). С. 27—33.
Journal of International Law and International Relations. 2021. N 3 (98). P. 27—33.

УДК 325.2

# АСАБЛІВАСЦІ АДАПТАЦЫІ БЕЛАРУСКІХ ЭМІГРАНТАЎ У АРГЕНЦІНЕ (1918—1939 гг.)

**Вольга Коваль**

*Артыкул прысвечаны праблемам фарміравання беларускай дыяспары ў Аргенціне ў міжваенны перыяд. Асаблівая ўвага надаецца аналізу сацыяльнай, прававой, эканамічнай, псіхалагічнай і фізіялагічнай адаптацыі беларусаў, негатыўнаму ўплыву моўнага бар’ера і стрэсу акультурацыі эмігрантаў. Аўтар выдзяляе два перыяды ў эміграцыйнай палітыцы ўладаў Аргенціны і дэманструе іх уплыў на становішча эмігрантаў. 1920-я гг. сталі спрыяльным перыядам для эміграцыі. Аргенціна праводзіла палітыку «адчыненых дзвярэй» у дачыненні да эмігрантаў, якія разглядаліся ў якасці працоўных рэсурсаў. Эміграцыйная палітыка ўраду Аргенціны змянілася ва ўмовах сусветнага эканамічнага крызісу. На дзяржаўным узроўні пачалі абмяжоўваць эміграцыйныя плыні. Высокі ўзровень беспрацоўя ва ўмовах крызісу не даваў магчымасці беларускім эмігрантам паспяхова справіцца з культурным шокам першапачатковай адаптацыі.*

*Ключавыя словы: акультурацыя; Аргенціна; беларуская дыяспара; беларуская эміграцыя; сацыяльна-псіхалагічная адаптацыя; сусветны эканамічны крызіс.*

***«The Adaptation Features of the Belarusian Emigrants in Argentina (1918—1939)» (Volha Koval)***

*The article deals with the problems of the formation of the Belarusian diaspora in Argentina during the interwar period. Particular attention is paid to the social, legal, economic, psychological and physiological adaptation of the Belarusians, the negative impact of the language barrier and the acculturation stress of emigrants. The author allocates two periods in the emigration policy of Argentina and demonstrates their influence on the position of immigrants. 1920s were the favorable period for the emigration. The «open door» policy was implemented by Argentina for the emigrants as a potential labor resource. The article analyses the impact of the world economic crisis on the community of the Belarusian emigrants. In addition, the article shows the main features of the government emigration policy in Argentina. The state authorities tried to limit the emigration flow and organised the support for the unemployed. The Belarusian emigrants had a hard time with the culture shock of the initial adaptation during the period of the high unemployment.*

*Keywords: acculturation; Argentina; Belarusian diaspora; Belarusian emigration; global economic crisis; socio-psychological adaptation.*

Адаптацыя эмігрантаў — гэта сацыяльны і шматаспектны працэс. Выдзяляюць сацыяльна-псіхалагічную, прававую, эканамічную, культурную, фізіялагічную, а таксама унутраную адаптацыю, якая характарызуецца камфортным псіхалагічным станам эмігранта ў прымаючым грамадстве, і знешнюю, калі асоба пачынае займацца актыўнай грамадскай дзейнасцю, што значна пашырае яе сацыяльныя кантакты. Узровень паспяховасці адаптацыі эмігрантаў у Аргенціне можна вызначыць па ступенні іх задаволенасці якасцю жыцця (працаўладкаванне, забяспечанасць жыллём, сацыяльная актыўнасць у прымаючым грамадстве і інш.). Ва ўмовах іншакультурнага грамадства беларусы былі вымушаны прызвычайвацца да новых эканамічных, культурных, палітычных, прыродных і сацыяльных умоў Аргенціны і пры гэтым захоўваць сваю этнічную ідэнтыфікацыю і самасвядомасць.

Гісторыя беларускай міжваеннай эміграцыйнай хвалі ў Аргенціне з’яўляецца часткай агульнага працэсу фарміравання нацыянальнай дыяспары. Беларуская эміграцыя ў краінах Лацінскай Амерыкі ў асноўным складалася з жыхароў Заходняй Беларусі, якая з 1921 г. уваходзіла ў склад Другой Рэчы Паспалітай. Станаўленне і развіццё нацыянальнай дыяспары ў Аргенціне вызначыліся адметнымі рысамі, якія былі абумоўлены ў першую чаргу дзяржаўнай палітыкай і эканамічнай сітуацыяй краіны-рэцыпіента.

*Аўтар:*
**Коваль Вольга Уладзіміраўна** — кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі інжынерна-эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, *e-mail: koval@belstu.by*
*Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт. Адрас: 13а, вул. Свярдлова, Мінск, 220006, БЕЛАРУСЬ*

*Author:*
**Koval Volha** — Candidate of History, Associate Professor of the Department of History of Belarus and Political Science of the Economic Engineering Faculty, Belarusian State Technological University, *e-mail: koval@belstu.by*
*Belarusian State Technological University. Address: 13a, Sverdlova str., Minsk, 220006, BELARUS*

Мэта артыкула — прааналізаваць асаблівасці сацыяльна-псіхалагічнай, прававой, эканамічнай, культурнай, фізіялагічнай адаптацыі беларускіх эмігрантаў у Аргенціне ў міжваенны перыяд (з 1918 па 1939 г.) — час найбольш інтэнсіўнай эміграцыі з тэрыторыі Другой Рэчы Паспалітай.

Аналізам эміграцыі беларусаў у Аргенціну займаюцца як айчынныя гісторыкі, так і замежныя спецыялісты. Вядучым айчынным гісторыкам па эміграцыі і рээміграцыі беларусаў у Аргенціне з'яўляецца С. В. Шабельцаў [9—11]. Да гісторыі беларусаў у краінах Лацінскай Амерыкі таксама звярнулася ў сваёй манаграфіі расійская даследчыца працэсаў дыяспаральнасці М. М. Масейкіна [7]. Украінскі гісторык С. П. Качараба прывёў гістарычныя факты з мінулага беларускага замежжа пры аналізе эміграцыі з тэрыторыі Заходняй Украіны ў міжваенны перыяд [4; 5]. Пералічаныя аўтары ў сваіх публікацыях закранаюць пытанні адаптацыі эмігрантаў, аднак грунтоўных даследаванняў адаптацыйных працэсаў беларусаў у Аргенціне пакуль няма.

Эканамічная мадэрнізацыя і развіццё транспартных сродкаў адкрылі шырокія магчымасці для масавай эміграцыі еўрапейцаў на іншыя кантыненты. Асноўнымі эміграцыйнымі цэнтрамі ў міжваенны перыяд сталі ЗША, Канада, Аргенціна, якія валодалі багатымі зямельнымі рэсурсамі пры недахопе працоўнай сілы. Эміграцыйную палітыку Аргенціны канца XIX — пачатку XX ст. у сучаснай замежнай гістарыяграфіі прынята называць палітыкай «адчыненых дзвярэй» [17, p. 91], што падкрэслівае ліберальнае стаўленне ўраду краіны да эканамічных эмігрантаў. У Аргенціне ў пачатку 1920-х гг. жылі толькі 10 млн чалавек на плошчы 2798 тыс. кв. км, краіна мела зямельны фонд болей за 80 млн га (з якіх было апрацавана толькі 24 млн га) [5, с. 184]. Дзяржава стымулявала эміграцыю, бо мела эканамічную патрэбу ў працоўным рэсурсе. Існаваў фактычна мінімальны адбор для эмігрантаў, таму людзі адносна хутка афармлялі свае дакументы ў Аргенціну.

Пачатак 1920-х гг. — перыяд эканамічнага росту Аргенціны, быў найбольш спрыяльным для эмігрантаў. На адаптацыйныя працэсы пазітыўна паўплывалі стабілізацыя працоўнай занятасці, рост прыбыткаў насельніцтва, пашырэнне сельскагаспадарчых надзелаў. Беларусы ў Аргенціне займаліся вырошчваннем чая «матэ», тытуню, рыса, кукурузы. Эмігранты ўладкоўваліся на будаўніцтва чыгуначнага палатна, на цэментныя заводы, некаторыя траплялі на нафтаздабычу. Пікавым перыядам для масавай эміграцыі ў Аргенціну стаў 1923 г. [17, p. 92]. Аднак гісторыя эміграцыйных плыняў асобных народаў мае свае адметнасці. У Другой Рэчы Паспалітай развіццё сеткі замежных карабельных кампаній у 1920-я гг., актыўная агітацыя прадстаўнікоў дзяржаўных эміграцыйных органаў і агентаў карабельных ліній паўплывалі на рэзкае павелічэнне колькасці эмігрантаў. Пікавы перыяд эміграцыі з Другой Рэчы Паспалітай у Аргенціну прыпаў на 1926—1930 гг., пра што сведчаць польскія статыстычныя дакументы, якія прадстаўляюць агульныя гадавыя лічбы эмігрантаў (з усёй тэрыторыі дзяржавы): 1926 г. — 15 810 чалавек, 1927 г. — 22 031, 1928 г. — 27 036, 1929 г. — 21 703, 1930 г. — 16 940 чалавек [13, sygn. 9886, str. 140].

Сусветны эканамічны крызіс і заканадаўчыя абмежаванні рэзка скарацілі колькасць эмігрантаў з тэрыторыі Польшчы, павялічылі рух рээміграцыі. На радзіму вярнуліся тыя асобы, хто не справіўся з праблемамі эканамічнай адаптацыі, не здолеў дасягнуць аптымальных ўзаемаадносін у іншакультурным грамадстве.

Пры даследаванні беларускай дыяспары ў Аргенціне неабходна асобна разглядаць рээміграцыю беларусаў, якая набыла масавы характар пасля Другой сусветнай вайны. Беларускія арганізацыі ў Аргенціне, як правіла, былі прасавецкімі, а іх кіраўнікі часта з'яўляліся членамі Камуністычнай партыі Аргенціны. Таму пасля вайны актыўныя ўдзельнікі аб'яднанняў і таварыстваў імкнуліся выехаць у СССР.

У міжваенны перыяд сітуацыя з рээмігрантамі выглядала інакш. Пікавым для рээміграцыі стаў перыяд з 1929 па 1933 г., пра што сведчаць польскія статыстычныя дакументы: 1929 г. — вярнулася ў Польшчу 1778 чалавек, 1930 г. — 2439, 1931 г. — 2385, 1932 г. — 2385, 1933 г. — 2105 чалавек [13, sygn. 9886, str. 143].

Павелічэнне колькасці рээмігрантаў тлумачылася беспрацоўем і напружаным станам грамадства Аргенціны. Такое становішча было выклікана сусветным эканамічным крызісам. Дынаміку рээміграцыі ўважліва адсочвала Міністэрства замежных спраў Польшчы. У справаздачы за 1934 г. міністэрства прааналізавала інтэнсіўнасць эміграцыйнага руху. Пры гэтым падкрэслівалася, што ў 1932 і 1933 гг. колькасць рээмігрантаў з Аргенціны перавысіла колькасць выехаўшых асоб: у 1932 г. выехалі ў Аргенціну 2056 чалавек, а вярнуліся 2141 чалавек, адпаведна ў 1933 г. выехалі 1724, а рээміграваліі 2105 чалавек [13, sygn. 9580, str. 70]. Супрацоўнікі міністэрства і Эміграцыйнага ўпраўлення ў справаздачы тлумачылі падобную сітуацыю выключна эканамічнымі праблемамі прымаючага грамадства.

Беларускія эмігранты кампактна засяляліся ў пэўных правінцыях Аргенціны, дзе існаваў багаты зямельны фонд для вядзення сельскай гаспадаркі: правінцыі Буэнас-Айрэс, Кордава, Чака, Мендоса, Місьёнэс, Санта-Фэ [4, с. 215]. Колькасць беларусаў у Аргенціне падлічыць складана, таму ўсе даследчыкі падаюць

прыблізную лічбу, ацэньваючы міжваенную эміграцыйную хвалю. Беларусы мелі польскія пашпарты, а ў дакументах для эміграцыі яны часта не пазначалі сваю нацыянальнасць. Спецыялісты сыходзяцца на меркаванні, што маштабы эміграцыйнай хвалі беларусаў у Аргенціну складалі ў міжваенны перыяд каля 20 000 чалавек [9, с. 16]. Статыстычныя дакументы Другой Рэчы Паспалітай могуць толькі ўскосна пацвердзіць колькасць эмігрантаў.

Польскія ўлады стымулявалі выезд у эміграцыю беларусаў і ўкраінцаў, што, на іх думку, павінна было вырашыць міжнацыянальныя канфлікты ў Другой Рэчы Паспалітай.

Пытанні эміграцыі аналізавала і кантралявала Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, пры якім дзейнічалі Эміграцыйнае ўпраўленне, Дзяржаўнае бюро па працаўладкаванні, спецыяльна створаны эміграцыйны апарат, які быў рэарганізаваны ў пачатку 1930-х гг. [21, s. 113]. Эміграцыя насельніцтва ў міжваенны час з'яўлялася важнай сацыяльнай праблемай для польскіх уладаў, якія стымулявалі эміграцыю беларусаў і ўкраінцаў, каб паскорыць паланізацыю гэтак званых «усходніх крэсаў».

Дзяржаўныя эміграцыйныя органы спрабавалі ажыццяўляць інфармацыйную працу сярод жадаючых эміграваць, бо шмат асоб у краінах Лацінскай Амерыкі не справіліся з фізіялагічным і псіхалагічным стрэсам. На думку польскіх чыноўнікаў, людзям працей будзе наладжваць свой побыт і псіхалагічна адаптавацца да жыцця ў Аргенціне пры больш шырокім інфармаванні для патэнцыяльных эмігрантаў. Эміграцыйнае упраўленне распаўсюджвала лістоўкі, у якіх апісвала асаблівасці побыту, культуры і традыцый у Аргенціне. Напрыклад, у матэрыяле ад 25 лістапада 1926 г. пазначалася: «Па прычыне таго, што дзяржаўныя землі не прыгатаваныя да каланізацыі, трэба доўга чакаць вымярэння надзелу. Прыватныя землі прадаюцца па завышаных у некалькі разоў коштах» [8, спр. 575, арк. 1]. Упраўленне спрабавала патлумачыць рызыкі вядзення сельскай гаспадаркі ў нязвыклым клімаце Аргенціны, дзе эмігранты былі вымушаныя вырошчваць экзатычныя для еўрапейцаў расліны (чай матэ, бавоўну, рыс, каву, цукровы трыснёг). Дзяржаўны орган для пашырэння сваёй інфармацыйнай работы падрыхтаваў памятку для 15 000 патэнцыяльных эмігрантаў у Аргенціну пра ўмовы працы прамысловых рабочых і сялян, геаграфічнае становішча і асаблівасці вядзення сельскай гаспадаркі [8, спр. 591, арк. 2]. У падобных матэрыялах падкрэслівалася, што праблемай для сялян маглі стаць не толькі знішчаныя насякомымі ўраджаі, але і непрадбачаныя змены коштаў на сельскагаспадарчую прадукцыю, якія адразу скарачалі рэнтабельнасць продажу.

Інфармаванне асоб, на думку чыноўнікаў, павінна было знізіць узровень уплыву на грамадства рэкламы агентаў карабельных кампаній, якая стымулявала рост эміграцыі ў Аргенціну ў 1920—1930-я гг. Агенты пасяхова працавалі на тэрыторыях Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, дзе былі нізкія заробкі і абмежаваны зямельны фонд. Беларускамоўная прэса дапамагала інфармацыйнай рабоце Эміграцыйнага ўпраўлення: віленскія газеты («Наша праўда», «Сялянская ніва», «Беларуская крыніца» і інш.) рэгулярна публікавалі адкрытыя лісты пра побыт і працу беларускіх сялян у Аргенціне, дзе ўздымаліся рэальныя праблемы эмігрантаў і апісваліся іх падманутыя чаканні [6; 12; 14; 19]. «Ня слухайце агентаў, што падмаўляюць на выезд, дакляруючы і зямлю, і заробкі. Нічога гэтага няма. Намаўляюць яны дзеля свайго заробку. Калі будзе такі агент хваліць Амэрыку, дык найлепей у яго спытацца, чаму ён сам ня едзе, калі там так добра», — даваў параду беларускі эмігрант у Аргенціне ў сваім адкрытым лісце да рэдакцыі газеты «Сялянская ніва» [6, с. 3].

Па запыту Эміграцыйнага ўпраўлення пры Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны карабельныя таварыствы былі павінны штомесячна дасылаць звесткі пра колькасць эмігрантаў, якія карысталіся паслугамі іх кампаній. Самымі распаўсюджанымі таварыствамі ва ўсходніх ваяводствах Польшчы былі: *«Royal Mail Line», «Cunard Line», «Holland-America Line», «White Star Line», «Nelson Line», «Chargeurs Réunis»* [8, спр. 880, арк. 1]. Усе пералічаныя кампаніі мелі сваіх прадстаўнікоў ці цэнтральныя офісы ў Варшаве, якія займаліся падрыхтоўкай статыстычных звестак пра колькасць іх пасажыраў.

Да сусветнага эканамічнага крызісу, які пачаўся ў ЗША ў кастрычніку 1929 г. з падзення фондавага рынку, беларусам у Аргенціне было значна працей знайсці працу. Найбольш заможныя эмігранты маглі набыць надзел зямлі па прымальных коштах, які ім яшчэ неабходна было падрыхтаваць да сельскагаспадарчых работ. Гаспадар зямлі ў выніку атрымоўваў усе грамадзянскія правы, што станоўча ўплывала на прававую адаптацыю асобы. Выплату агульнай сумы за зямлю можна было расцягнуць да 10 год, аднак за свой надзел гаспадар павінен быў правесці землеўпарадкаванне. Пры атрыманні канцэсіі на зямельны надзел эмігрант браў на сябе абавязкі: 1) пабудаваць жылы будынак і выкапаць калодзеж; 2) абгарадзіць зямлю дротам; 3) пасадзіць і ўтрымліваць у належным стане вызначаную колькасць дрэў; 4) распрацаваць не менш за 50 % атрыманай зямельнай плошчы; 5) пастаянна пражываць на набытым зямельным надзеле [4, с. 216]. Уладальнікам надзела можна было стаць толькі пры поўнай аплаце зямлі і пры рэалізацыі ўсіх пунктаў дамовы. Сяляне-эмігранты імкнуліся ўладкавацца на працу

да гаспадароў з ліку былых эмігрантаў, што спрашчала іх пабытовыя сітуацыі сацыяльна-псіхалагічнай адаптацыі.

Міжваенная эміграцыйная хваля ў Аргенціну складалася ў асноўным з маладых мужчын (ва ўзросце ад 20 да 30 гадоў) з нізкай прафесійнай кваліфікацыяй, без сям'і [15, p. 29]. Першапачаткова адсутнасць прафесійнай адукацыі дазваляла эмігрантам паспяхова канкурыраваць на рынку працы без страты прыбыткаў. Аднак у гады сусветнага эканамічнага крызісу нізкая кваліфікацыя эмігрантаў з'яўлялася адной з прычын іх беспрацоўя ў галіне прамысловасці. З прычыны высокага ўзроўню беспрацоўя ўлады Аргенціны намагаліся абмяжоўваць узрост эмігрантаў (нават высокакваліфікаваных рабочых).

Умоўна можна выдзяліць два перыяды ў эміграцыйнай палітыцы ўраду Аргенціны:

— з 1918 да 1929 г. (да пачатку сусветнага эканамічнага крызісу);

— з 1929 да 1939 г. (перыяд значных абмежаванняў для эмігрантаў).

Эміграцыйны сіндыкат у Брэсце атрымаў прадпісанне ад цэнтральнага офіса ў Варшаве пра абмежаванне пры афармленні дакументаў для эміграцыі ўзростам 60 гадоў (ад 14 снежня 1932 г.) [3, арк. 29]. У дакуменце тлумачылася, што асоба не павінна мець поўных 60 год на момант прыбыцця ў Аргенціну.

Аргенцінскі ўрад мэтанакіравана адбіраў маладых і здаровых людзей, бо эмігранты мелі магчымасць уладкавацца толькі на цяжкую працу з нізкімі заробкамі. Значная частка беларусаў у Аргенціне займалася сельскай гаспадаркай ва ўмовах субтропікаў, што было фізічна складана: «Працэс апрацоўкі адбываўся наступным чынам. Валілі дрэвы пад корань, па прычыне спякоты усё гэта хутка высыхала і пасля падпальвалі. Усё гэта гарэла, а праз тыдзень зноў нешта вырастала — тады зноў секлі і палілі. І нарэшце сярод пнёў садзілі кукурузу: адтуліну рабілі палачкай, кідалі зярнятка. У далейшым пні выкарчоўвалі» [11, с. 9]. Надзел зямлі фактычна неабходна было апрацоўваць падсечна-агнявым спосабам, што маглі зрабіць толькі фізічна моцныя і здаровыя людзі.

Тыя эмігранты, якія не спраўляліся з сельскагаспадарчай работай у Аргенціне, накіроўваліся ў вялікія гарады, дзе ў пошуках працы рабіліся валацугамі. У сваім лісце да рэдакцыі віленскай газеты «Беларуская крыніца» эмігрант-беларус Язэп Маркевіч апісвае сітуацыю праблемнай эканамічнай і фізіялагічнай адаптацыі суайчыннікаў у Аргенціне: «Тут людзі так церпяць, што апісаць нельга. Эмігрантаў найбольш адпраўляюць у лясы і на чыгунку. Работа там страшэнная. Каторыя ня могуць выдзяржаць, дык прыходзіцца ім ісці па некалькі сот вёрстаў пехатой да горада Буэнас-Айрэс. Але і там няма нічога добрага. Работы, праўда, больш, чым перш, але і народу наехала ў 50 разоў болей» [19]. Сусветны эканамічны крызіс значна пагоршыў сітуацыю з пошукам працы для эмігрантаў, бо эканоміка Аргенціны дастаткова хутка патрапіла ў рэцэсію.

Недахоп сродкаў і адсутнасць сталай працы прыводзіла шматлікіх эмігрантаў да канфліктнага эмацыянальнага стану фрустрацыі, адчування адчужэння, дэзарыентацыі. Эмацыянальны стан эмігрантаў, іх разгубленасць і падаўленасць пры праблемнай адаптацыі найлепш дэманструюць апублікаваныя ў прэсе лісты з Аргенціны: «У выніку гэтага страшэнна здзекуюцца над нашымі людзьмі: плацяць колькі хочуць і за найменшы праступак пазбаўляюць працы» [19]. Па сутнасці, вострае адчуванне несправядлівасці і дыскрымінацыі ў дачыненні эмігрантаў фарміравала пачуццё псіхалагічнай уразлівасці.

У перыяд сусветнага эканамічнага крызісу ўпалі кошты на экспартныя тавары, скараціліся прамысловыя магутнасці, паменшыліся заробкі, вырасла беспрацоўе. Сярэдні заробак прамысловага працоўнага (калі прыняць індэкс 100 у 1929 г.) знізіўся да 81 у 1932 г. і да 77 у 1934 г. [20, p. 311]. Дапаўненнем да эканамічных праблем сталі засухі ў пачатку 1930-х гг. і знішчэнне ўраджаяў саранчой. Урад Аргенціны спрабаваў дапамагчы, але справіцца з сітуацыяй было складана: ствараліся лагеры беспрацоўных, галадаючых у гарадах карміла вайсковая кухня. У лагерах беспрацоўных у Буэнас-Айрэсе, Мар-дэль-Плаце, Расарыа трацїну жыхароў складалі эмігранты [16, p. 142]. У такіх абставінах урадавыя органы спрабавалі звесці да мінімуму эміграцыю, таму ўводзіліся дадатковыя абмежаванні пры афармленні візы ў Аргенціну.

Беларусы ў Аргенціне, як і іншыя дыяспары, стваралі свае нацыянальныя грамадскія арганізацыі, якія займаліся правядзеннем культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў і вырашалі пытанні эканамічнай адаптацыі людзей. Нацыянальныя аб'яднанні садзейнічалі працэсу сацыяльнай адаптацыі беларусаў, дасягненню псіхалагічнага камфорту, дапамагалі ўвайсці ў сістэму адносін новага сацыякультурнага грамадства. Сацыяльная адаптацыя ўяўляла сабой дзейнасць, накіраваную на аптымізацыю ўзаемадзеяння эмігрантаў з новым сацыяльным асяроддзем.

Гістарычных крыніц пра дзейнасць беларускіх палітычных арганізацый захавалася мала, што ўскладняе аналіз іх уплыву на нацыянальную супольнасць. Даследчык гісторыі беларускай дыяспары Аргенціны С. В. Шабельцаў адзначае дзейнасць Саюза ўкраінскіх і беларускіх рабочых арганізацый, Федэрацыі беларускіх таварыстваў і арганізацый у Аргенціне [9, с. 17]. У манаграфіі С. Цыпко ўзгадваецца пра работу Федэрацыі

украінскіх, беларускіх і польскіх вытворцаў [16, p. 147], якая намагалася абараняць эканамічныя інтарэсы эмігрантаў. Беларускія палітычныя арганізацыі ў Аргенціне, якія пачалі стварацца ў 1930-я гг., вызначаліся сваім «левым» ухілам.

У міжваенны перыяд беларусы Аргенціны толькі пачалі фарміраваць сталую дыяспару, далёка не ўсе ініцыятывы мелі поспех. Аналіз дзейнасці грамадскіх арганізацый беларускай эміграцыі ў Аргенціне дазваляе зрабіць выснову пра слабую арганізацыйную актыўнасць у міжваенны час. Пра слабую грамадскую дзейнасць беларусаў у Аргенціне пісалі самі эмігранты: «Няма куды прыхіліцца і, як кажуць, хоць ад часу да часу душой адпачыць. Цяпер толькі я і мае кумпаны зразумелі, што без арганізацыі жыць немагчыма. Дык арганізуйцеся, браты, на Бацькаўшчыне! А арганізацыя з Бацькаўшчыны перакінецца і ў чужыя старонкі, дзе жывуць беларусы» [14]. Эмігранты разлічвалі на дапамогу метраполіі ў стварэнні інстытуцыянальных форм дыяспары, якія павінны былі захаваць этнічную самасвядомасць і нацыянальную ідэнтыфікацыю ў замежжы.

Эмігранты ў Аргенціне гублялі сваё звыклае сацыяльнае асяроддзе, «культурны шок» (ці «акультурацыйны стрэс») праяўляўся ў адчуванні немагчымасці эфектыўна ўзаемадзейнічаць з тытульнай нацыяй. Міжкультурная камунікацыйная кампетэнтнасць беларусаў развівалася з тымі дыяспарамі, у стасунках з якімі ў меншай ступені перашкаджаў моўны бар'ер. Беларускія эмігранты ў Аргенціне паспяхова супрацоўнічалі з украінцамі, палякамі, расіянамі, нават стваралі міжнацыянальныя арганізацыі (федэрацыі ўкраінскіх, беларускіх і польскіх вытворцаў, Саюз украінскіх і беларускіх рабочых арганізацый і інш.). Нярэдка актыўныя дзеячы такіх грамадскіх аб'яднанняў мелі адна лькавыя палітычныя погляды.

Нацыянальныя арганізацыі як інстытуцыянальныя формы беларускай дыяспары павінны былі спрыяць працэсу акультурацыі эмігрантаў. Паняцце «акультурацыя» ў навуковы зварот увялі яшчэ ў 1930-я гг. Тэрмін зараз пашырыў сваё значэнне і выкарыстоўваецца спецыялістамі па эмігрантазнаўству і кроскультурнай псіхалогіі. Псіхолагі вылучаюць чатыры асноўныя «стратэгіі акультурацыі»: асіміляцыю, сепаратызацыю, маргіналізацыю і інтэграцыю [18, p. 21]. У выпадку паспяховай адаптацыі беларускіх эмігрантаў у Аргенціне адбывалася інтэграцыя асобы ў прымаючае грамадства.

Акультурацыя ўяўляла сабой уплыў культурных стандартаў дамінуючага этнасу на мадэль паводзін эмігрантаў. Першапачатковы кантакт з новай культурай выклікаў пачуццё «культурнага шоку», высокай нярвовасці, эмацыянальнага дыскамфорту. Толькі пры ўмове паспяховай адаптацыі і акультурацыі эмігрантаў у Аргенціне адбывалася інтэграцыя асоб у прымаючае грамадства, калі фарміравалася пазітыўнае стаўленне беларусаў да аргенцінскай культуры.

Згодна сфарміраванай гістарыяграфічнай традыцыі, спецыялісты па эмігрантазнаўству, як правіла, надаюць значную ўвагу палітычным і эканамічным аспектам беларускага замежжа, абмінаючы культуру. Аднак пры вывучэнні адаптацыйных працэсаў патрэбна вылучаць культурна-асветніцкія мерапрыемствы эмігрантаў, якія былі накіраваныя на стварэнне станоўчых эмоцый, фарміравалі пачуццё камфорту і ўпэўненасці. Інтэграцыя асобы ў грамадства Аргенціны садзейнічала развіццю культурнай ідэнтыфікацыі да новага сацыякультурнага асяроддзя пры захаванні ўласнай культурнай прыналежнасці. Менавіта культура аказвала ўплыў на каштоўнасці і арыенціры эмігрантаў. Інтэграцыя была вынікам паспяховай адаптацыі эмігрантаў, патрэбны быў час, каб пераадолець моўны бар'ер, засвоіць новыя мадэлі паводзін, нормы, сацыяльныя каштоўнасці аргенцінскага грамадства. Па сутнасці, у першым пакаленні эмігранты так і заставаліся іншымі, непадобнымі на прадстаўнікоў дамінуючага этнасу, што і стымулявала іх кансалідацыю ў 1930-я гг., калі ў Аргенціне пачалі дзейнічаць беларускія арганізацыі.

Слабую грамадскую актыўнасць беларускай супольнасці ў Аргенціне ў 1920-я гг. крытыкавалі і самі беларускія эмігранты. Віленская газета «Беларуская крыніца» апублікавала «Ліст з Аргенціны», дзе дакладна апісвалася сітуацыя ў канцы 1920-х гг.: «Нямала ёсць у Аргенціне і нас, эмігрантаў-беларусаў. Толькі на чужыне сярод рознанацыянальных людзей мы, беларусы, губляемся. Усе іншыя эмігранты маюць свае нацыянальныя арганізацыі, а мы, беларусы, на вялікі жаль, такой не маем» [14]. Дакор эмігранта з Аргенціны слушны, ён разумеў і бачыў сацыяльную падтрымку ў асяроддзі іншых дыяспар, калі нацыянальныя арганізацыі спрыялі пераадоленню моўнага і камунікацыйнага бар'ера, задавальнялі патрэбы асоб у самаарганізацыі, эканамічна падтрымлівалі сем'і.

Важную ролю ў працэсе акультурацыі і сацыяльна-псіхалагічнай адаптацыі адыгрывалі беларускія культурна-асветніцкія арганізацыі, якія пачалі ўзнікаць у Аргенціне толькі з другой паловы 1930-х гг., бо прадстаўнікам эканамічнай эміграцыйнай хвалі не хапала арганізацыйнага вопыту іх стварэння і развіцця. У снежні 1934 г. у Буэнас-Айрэсе было заснавана першае Беларускае культурна-асветнае таварыства «Грамада», у канцы снежня 1935 г. — таварыства «Культура», у студзені 1937 г. — Таварыства бібліятэкі імя Івана Луцэвіча, а ў кастрычніку 1938 г. — таварыства «Белавежа» [1, с. 367]. Члены таварыстваў займаліся вывучэннем моў,

арганізоўвалі лекцыі, ладзілі вечарыны і спектаклі. Слабая крыніцазнаўчая база не дазваляе ў поўнай ступені ацаніць іх дзейнасць у рамках адаптацыйных працэсаў эмігрантаў. Вядома, што выключны поспех меў спектакль «Мікітаў лапаць», пастаўлены таварыствам «Культура» ў Буэнас-Айрэсе ў 1938 г. [2, арк. 44]. Тэатральная пастаўноўка дапамагала эмігрантам справіцца з пачуццём настальгіі, пра што сведчыць афіша спектакля: «Хто пабачыць камэдыю "Мікітаў лапаць", перанясецца мысьляй на сваю далёкую Бацькаўшчыну, пабачыць жыццё роднай вёскі, пачуе на сцэне родную мову і ўспомніць пра далёкае прошлае» [10, с. 14]. Няведанне іспанскай мовы эмігрантаў у Аргенціне значна ўскладняла іх індывідуальную адаптацыю, камунікацыйны бар'ер прымушаў беларусаў кантактаваць пераважна ў эміграцыйным асяроддзі.

Біялагічная адаптацыя была звязана са складанай акліматызацыяй на лацінаамерыканскім кантыненце. Сур'ёзным выпрабаваннем для шматлікіх эмігрантаў станавілася падарожжа ў Аргенціну на караблях, якое працягвалася 7—8 дзён. Асноўная частка беларускай міжваеннай эміграцыйнай хвалі пасялілася на поўначы Аргенціны, таму іх акліматызацыя праходзіла ва ўмовах субтрапічнага клімату. Пра складанасці акліматызацыі ў спякотным і вільготным клімаце Аргенціны пісалі беларускія эмігранты ў сваіх адкрытых лістах у рэдакцыі беларускамоўных газет: «Дома нашаму брату жывецца дрэнна, але ў Аргентыне яшчэ горш. Зразу па прыезьдзе заработкаў мала і цяжкія яны вельмі. Працу можна знайсьці найчасцьцей пры пракладаньні чыгунак, сеч лясы, дзёрці карчы, разрываць скалістыя горы і то працаваць трэба пры такой гарачыні, што нашаму брату вельмі цяжка вытрымаць» [12]. Працэс прыстасавання арганізма да новых кліматычных умоў працягваўся месяцамі і нават гадамі.

Падводзячы вынікі, можна канстатаваць, што ў 1920-я гг. Аргенціна праводзіла палітыку «адчыненых дзвярэй» у дачыненні эмігрантаў. Аднак у 1930-я гг. сітуацыя змянілася, што было абумоўлена сусветным эканамічным крызісам. Эміграцыйны апарат Другой Рэчы Паспалітай намагаўся кантраляваць працэсы перасялення, аднак стымулявала эміграцыю ў краіны Лацінскай Амерыкі рэклама карабельных агентаў. Адаптацыя беларускіх эмігрантаў у Аргенціне разглядалася ў кантэксце эканамічнай міжваеннай эміграцыі. Інтэнсіўнасць эміграцыйнага руху і рээміграцыі залежала ад заканадаўства дзяржавы-рэцыпіента і ад кан'юнктуры на рынку працы Аргенціны, які хутка рэагаваў на глабальныя эканамічныя працэсы. Эканамічны крызіс стаў прычынай праблемнай адаптацыі большасці эмігрантаў, якія прыбывалі ў краіну з канца 1920-х гг. Эмацыянальны стан беспрацоўных беларусаў у гэты перыяд яскрава дэманструюць беларускамоўныя перыядычныя выданні як асноўныя гістарычныя крыніцы па праблеме адаптацыі.

Нацыянальныя культурна-асветніцкія арганізацыі ў Аргенціне дапамагалі беларусам у працэсе іх сацыяльна-псіхалагічнай адаптацыі. Аднак, як адзначалі самі эмігранты, актыўнасць такіх аб'яднанняў у 1920-я гг. была невысокай. Асобы, якія былі далучаныя да культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў беларускіх арганізацый, прасцей праходзілі першапачатковую сацыяльна-псіхалагічную адаптацыю. Беларускія арганізацыі, якія актыўна ствараліся ў 1930-я гг., мелі «левы» палітычны ўхіл, стымулявалі пашырэнне міжэтнічных кантактаў, дапамагалі з акультурацыяй. На аснове прыведзеных фактаў можна зрабіць выснову, што культурныя вечарыны, беларускія спектаклі ў Аргенціне дапамагалі эмігрантам справіцца з сітуацыяй страты звыклых камунікацыйных сувязей.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Беларускае замежжа = Белорусское зарубежье / склад. Н. А. Голубева. — Мінск: Беларус. Энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2010. — 480 с.
2. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. — Ф. 3. — Воп. 1. — Спр. 48.
3. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. — Ф. 377. — Воп. 1. — Спр. 1.
4. Качараба, С. Еміграція з Західної України (1919—1939) / С. Качараба. — Львів: Львів. нац. ун-т імені Івана Франка, 2003. — 416 с.
5. Качараба, С. Еміграція населення Західної України в Аргентину / С. Качараба // Наук. зошити іст. фак. — 2001. — Вип. 4. — С. 184—196.
6. Лапацон, М. Ліст з Аргентыны / М. Лапацон // Сялян. ніва. — 1926. — № 33. — С. 3—4.
7. Мосейкина, М. Н. «Рассеяны, но не расторгнуты»: русская эмиграция в странах Латинской Америки в 1920—1960 гг. / М. Н. Мосейкина. — М.: РУДН, 2011. — 384 с.
8. Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны ў г. Львове. — Ф. 422. — Воп. 1.
9. Шабельцев, С. В. Адаптация белорусских иммигрантов в Аргентине в 1900—1950-х гг. / С. В. Шабельцев // Вестн. БГУ. Сер. 3. — 2008. — № 3. — С. 15—19.
10. Шабельцаў, С. В. Беларусы ў Аргенціне: грамадская дзейнасць і рээміграцыя ў СССР (1930—1960-я гг.): зб. дак. і ўспамінаў / С. В. Шабельцаў. — Мінск: Медысонт, 2009. — 368 с.
11. Шабельцев, С. В. Иммигранты-чакареро из II Речи Посполитой в Аргентине и Парагвае. Воспоминания белорусов и украинцев / С. В. Шабельцев. — Минск: РИВШ, 2011. — 94 с.
12. Эмігрант. Як жывецца нашым эмігрантам у Аргенціне // Наша праўда. — 1927. — № 4. — С. 4.
13. Archiwum Akt Nowych. Ministerstwo Spraw Zagranicznuch.
14. Biełuš, W. Pišmo z Arhientyny / W. Biełuš // Biełaruskaja Krynica. — 1928. — № 55. — S. 3.
15. Blanca, S. A. La época de las grandes migraciones: desde mediados del siglo XIX a 1930 / S. A. Blanca // Mediterráneo Económico: Procesos migratorio, economía y personas. — 2002. — № 1. — P. 19—32.

16. Cipko, S. Ukrainians in Argentina, 1897—1950. The making of a community / S. Cipko. — Edmonton; Toronto: Canadian Institute of Ukrainian Press, 2011. — 282 p.
17. De Cristóforis, N. Inmigrantes y colonos en la provincial de Buenos Aires: una mirada de largo plazo (siglos XIX—XXI) / N. De Cristóforis. — Cuidad Autónoma de Buenos Aires: Editorial de la Facultad de Filosofía y Letras Universidad de Buenos Aires, 2016. — 136 p.
18. Kuo, Ben C. H. Coping, acculturation, and psychological adaptation among migrants: a theoretical and empirical review and synthesis of the literature / Ben C. H. Kuo // Health Psychology and Behavioral Medicine. — 2014. — Vol. 2. N. 1. — P. 16—33. (https://doi.org/10.1080/21642850.2013.843459)
19. Markiewič, J. Z žyccia biełarusaŭ u Arhientynie / J. Markiewič // Biełaruskaja Krynica. — 1928. — № 22. — S. 4.
20. Porada, K. La inmigración y la crisis. Los polacos en el Buenos Aires de la década de los años treinta / K. Porada // Anuario de Estudios Americanos. — 2019. — Enero-Junio. — P. 301—328.
21. Reczyńska, A. Emigracja z Polski do Kanady w okresie międzywojennym / A. Reczyńska. — Wrocław [etc.]: Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk, 1986. — 223 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю ў чэрвені 2021 г.